УДК 821.161.3-32*Р.Баравікова

# ФАНТАСТЫЧНАЕ І РЭАЛІСТЫЧНАЕ Ў АПАВЯДАННІ РАІСЫ БАРАВІКОВАЙ “КАВА ДЛЯ ДАМАВІКА”

***Д. І. Кіарэску*** (ГДУ імя Ф. Скарыны)
Навук. кір. ***Т. А. Фіцнер,***
канд. філал. навук, дацэнт

Адной з сучасных айчынных пісьменніц нашага часу з’яўляецца Раіса Баравікова, якую часцей узгадваюць як паэтэсу. Аднак творчы дыяпазон яе значна шырэйшы. Сама пісьменніца ў адным з інтэрв’ю зазначае: “<…> мне хочацца нечага большага, і таму я часам спрабую зазірнуць у іншыя жанры…” [1, с. 68]. Змест вядомага празаічнага зборніка пісьменніцы “Вячэра манекенаў” складаюць апавяданні, напісаныя ў жанры псіхалагічнай фантастыкі. Апавяданне “Кава для дамавіка” з’яўляецца працягам лірычнага пачатку паэткі, яе геройнага лірычнага ўвасаблення. У ім гераіня ў свой дзень нараджэння задаецца пытаннем: “<…> можа, хто пазвоніць? А раптам? Раптам…званок! “Гэта я, не пазнаеш?.. А я помню. Сення твой дзень, хачу цябе бачыць” [2, с. 147]. Унутраны маналог дазваляе суаднесці празаічную гераіню з яе лірычным пачаткам. Успаміны гераіні абвастраюць яе жыццевыя праблемы: проста выгнала (пра свайго апошняга мужчыну), і ўсе; чамусьці сябе шкада; дзе пыласос; трэба выцерці пыл з мэблі, тое-сее памыць; узяцца за вячэру.

Дзеянне ў апавяданні адбываецца ноччу. Выбар аўтаркі невыпадковы: ноч – час для містычна-фантастычных прыгод. Сустрэча ў буфеце вакзала гераіні з незнаемым мужчынам у зяленых ботах з шырокімі халяўкамі цалкам мяняе лес гераіні. Доўгая начная размова з госцем за кубачкам кавы агаляе гаспадарчыя і жаночыя хібы адзінокай гераіні. А потым… Ранак. Звініць гадзіннік. І на кухні яна аж крычыць ад убачанага: за сталом сядзіць і п’е каву дамавік у тых жа зяленых боціках. Гэтая мастацкая дэталь дае падставу думаць, што мужчына ператварыўся ў дамавіка, якога пры змене месца жыхарства згубіла гераіня. Яго з’яўленне – знак, што гераіню чакае сустрэча з будучым блізкім чалавекам.

Такім чынам, Баравікова-празаік пры дапамозе фантастычнага сюжэта акцэнтуе ўвагу на рэальных жыццевых праблемах сваей гераіні і дае надзею на іх шчаслівае вырашэнне.

**Літаратура**

1. Творца ў кантэксце грамадства і часу : З Раісай Баравіковай гутараць супрацоўнікі часопіса “Крыніца” // Крыніца. – 1996. – № 5-6. – С. 68.
2. Вячэра манекенаў : Апавяданні / Раіса Баравікова. – Мінск : Маст. літ., 2002. – 186 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова